государства. При этом официальная власть посредством агентурных донесений сама фиксировала те смыслы и значения, которыми верующие наделяли современные события, которые оказывались недоступными непредвзятому научному анализу.

Несмотря на наличие уникальной информации, материалы агентурных донесений требует особо тщательного критического подхода и обязательного сравнение с другими историческими источниками, поскольку мотивы деятельности агентов, уровень их осведомленности, интеллектуальный и моральный уровень накладывают отпечаток на достоверность материала.


1. Бабенко, Л. Документи органів державної безпеки УСРР–УРСР про діяльність релігійних конфесій у 1920–1950-х рр. / Л. Бабенко // Історія України: маловідомі імена, події, факти : зб. ст. / Нац. акад. наук України, Ін-т історії України. – Київ, 2008. – Вип. 35. – С. 298–310.
2. Вєдєнєєв, Д. В. Документи органів державної безпеки як джерело дослідження соціокультурних особливостей «катакомбної» течії в Православ'ї в Українській РСР у 1920-ті – 1950-ті рр. / Д. В. Вєдєнєєв // Бібліотекознавство. Документознавство. Інформологія. – 2017. – № 1. – С. 26–36.
3. Зональный государственный архив в г. Полоцке (ЗГАПол). – Ф. 25. Оп. 1. Д. 9.
4. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 20.
5. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 36.
6. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 159.
7. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 163.
8. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 166.
9. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 171.
10. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 172.
11. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 173.
12. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 174.
13. ЗГАПол. – Ф. 28. Оп. 1. Д. 194.
14. Подкур, Р. Документы органов государственно безопасности УССР 1920–1930-х годов: источниковедческий анализ / Р. Подкур, В. Ченцов. – Тернополь : Збруч, 2010. – 372 с.
15. Тепляков, А. Г. Деятельность органов ВЧК–ГПУ–ОГПУ–НКВД (1917–1941 гг.): историографические и источниковедческие аспекты : монография / А. Г. Тепляков. – Новосибирск : НГУЭУ, 2018. – 434 с.


**Булатая В. Ю.**

## ПРАБЛЕМА ТЫПАЛАГІЗАЦЫІ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЙ ПРЭСЫ МІЖВАЕННАГА ЧАСУ (ПРАВАСЛАЎНЫЯ, КАТАЛІЦКІЯ, УНІЯЦКІЯ ВЫДАННІ)

У міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі прадстаўнікі разнастайных палітычных і царкоўных рухаў выдавалі беларускамоўную прэсу, якая адлюстроўвала іх погляды на палітычнае і нацыянальнае жыццё. Актуальнай праблемай крыніцазнаўства з'яўляецца тыпалагізацыя друкаваных выданняў міжваеннага часу. Абумоўлена гэта тым, што тыпалагізацыя дазваляе класіфікаваць міжваенныя друкаваныя выданні, вызначыўшы па пэўных прыкметах іх падабенства і адрозненні [1, с. 7]. Класіфікацыя прэсы, у сваю чаргу, дапамагае пры даследаванні як саміх выданняў, так і тэндэнцый, якія адлюстроўваліся ў матэрыялах. Адзначым, што пад тыпалагізацыяй мы разумеем метад навуковага пазнання, навуковай сістэматызацыі, класіфікацыі беларускамоўных міжваенных газет і часопісаў на аснове агульных для іх прыкмет і ўласцівасцей [10, с. 64].

У айчыннай гістарыяграфіі склалася традыцыя лічыць беларускамоўную прэсу, якую выдавалі праваслаўныя, каталіцкія і грэка-каталіцкія дзеячы, канфесійнай. Дадзены тэзіс быў сфармуляваны даследчыкам С. В. Говіным [3]. Аднак у сваёй працы "Канфесійны друк Беларусі" ён не акрэсліў метадалагічны падыход, паводле якога вызначыў, што дадзеныя выданні міжваеннага з'яўляюцца канфесійнымі па сваім тыпе [3]. На нашу думку, даследчык сыходзіў з таго, што выдаўцы вызначалі сваю прыналежнасць да пэўнай канфесіі і пазіцыянавалі сябе актывістамі царкоўнага і касцельнага руху. Аднак дадзены падыход не з'яўляецца цалкам аб'ектыўным, бо працэс тыпалагізацыі прэсы – досыць шматгранны: існуе шэраг іншых крытэрыяў, па якіх вызначаецца тып перыядычных выданняў.

Даследчык А. Акопаў, які прымяняў тэарэтыка-тыпалагічны метад даследавання прэсы, лічыў найбольш важнымі яго прыкметамі тэматычны кірунак і мэтавае прызначэнне, а ў якасці асноўных тыпафарміравальных фактараў ён вылучыў першасныя (тыпаўтваральныя: выдавецкі орган, унутраная структура, чытацкая аўдыторыя), другасныя (аўтарскі склад, унутраная структура, афармленне, жанры) і фармальныя прыкметы выдання (перыядычнасць, аб'ём, тыраж) [1].

Даследчык прэсы С. Каркаaccount сенка прапанаваў наступны тыпалагічны падзел перыёдыкі: па рэгіёне распаўсюджання, заснавальніку, аўдыторнай характарыстыцы, выдавецкіх характарыстыках, легітымнасці, змястоўным напаўненні [6, с. 76–82]. Аднак мы не можам цалкам прымяняць сучасны метадалагічны падыход да вызначэння тыпаў выданняў міжваеннага перыяду, бо рэаліі таго часу не ўваходзяць у сучасныя навукова-тэарэтычныя мадэлі.



Рэпазіторый ВГУ

Прааналізаваўшы розныя погляды даследчыкаў на праблемы тыпалогіі друкаваных выданняў, мяркуем, што ў якасці асноўных крытэрыяў тыпалагізацыі беларускамоўнай праваслаўнай, каталіцкай і грэка-каталіцкай прэсы міжваеннага перыяду варта лічыць наступныя: выдавецкі орган (выдавец), чытацкая аўдыторыя, мэтавая арыентацыя (праблемна-тэматычная арыентаванасць выдання) [10].

Дзеля вызначэння тыпу міжваенных выданняў разгледзім іх паводле абраных крытэрыяў. Адзначым, што намі разглядаўся беларускамоўны друк, да выдання якога прычыніліся праваслаўныя, каталіцкія і ўніяцкія дзеячы. Прытым выданні-аднадзёнкі намі не разглядаліся, бо яны знаходзяцца па-за межамі перыядычнага друку.

**Часопіс "Праваслаўны беларус" (1925).**

Выдавецкі орган: Варшаўская мітраполія.

Чытацкая аўдыторыя: праваслаўныя беларусы.

Мэтавая арыентацыя: пазіцыянаваў сябе як царкоўна-грамадскі, навукова-папулярны і літаратурны часопіс [8]. Тэмы артыкулаў – папулярызацыя беларускай мовы сярод вернікаў, адукацыя ў беларускіх школах, навіны з прыходаў і жыцця рэгіёнаў, гісторыя; друкаваліся афіцыйныя пастановы мітраполіі.

**Часопіс "Праваслаўная Беларусь" (1927–1928).**

Выдавецкі орган: Праваслаўнае Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне.

Чытацкая аўдыторыя: праваслаўныя беларусы, "якія не адсталі ад сваёй веры і нацыянальнасці" [7, с. 2].

Мэтавая арыентацыя: пазіцыянаваў сябе грамадска-царкоўным і палітычным двухтыднёвікам. Мэта – асвятленне палітычных, сацыяльных, нацыянальных і культурных пытанняў "з пункту гледжаньня хрысціянска-праваслаўнага" [7]. Значную ўвагу рэдакцыя надавала тэме выбараў у Сойм 1928 г., а таксама беларусізацыі Царквы.

**Часопіс "Беларуская зарніца" (1928–1929).**

Выдавец: святар А. Коўш.

Чытацкая аўдыторыя: праваслаўныя беларусы.

Мэтавая арыентацыя: пазіцыянаваў сябе як царкоўна-народны двухтыднёвік. Яго пазіцыя: "Гэта ні ад каго незалежны орган, які ўсебакова будзе высьвятляць царкоўнае, нацыянальнае, культурнае, гаспадарчае і палітычнае жыцьцё Беларускага народу з пункту гледжаньня рэлігіі" [2]. У часопісе друкаваліся матэрыялы, прысвечаныя беларусізацыі і сабornaсці Царквы, гістарычныя нарысы, казанні і духоўныя развагі.

**Часопіс "Голас праваслаўнага беларуса" (1931–1932).**

Выдавец: М. Маркевіч.

Чытацкая аўдыторыя: праваслаўныя беларусы.

Мэтавая арыентацыя: пазіцыянавала сябе як орган незалежнай царкоўна-грамадскай думкі і выходзіла ў адказ на крытыку Віленскай кансісторыі ў прэсе з боку ЦБПК і беларускай праваслаўнай моладзі [4]. У першым нумары вызначана мэта – абарона праваслаўя ад ЦБПК і ад некаторых друкаваных выданняў. Сярод тэм – незадаволенасць беларусізацыяй царквы, гісторыя ўніяцтва і разважанні аб адраджэнні ўніі, крытыка некаторых нацыянальных і праваслаўных рухаў, іх дзеячаў.

**Часопіс "Сьветач Беларусі" (1930–1933, 1936).**

Выдавецкі орган: Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт.

Чытацкая аўдыторыя: праваслаўныя беларусы.

Мэтавая арыентацыя: пазіцыянаваў сябе царкоўна-нацыянальным двухтыднёвікам. Мэта часопіса – абарона Царквы, пашырэнне і паглыбленне праваслаўя праз збліжэнне духавенства з народам. Тэма матэрыялаў – адлюстраванне палітычнага жыцця: публікацыя праграм і справаздач са сходаў ЦБПК, развагі пра стаўленне польскіх улад да Царквы. Сярод іншых тэм – царкоўны сабор, крытыка мітраполіі і Віленскай кансісторыі, навіны цэркваў, нарысы на хрысціянскія тэмы, беларусізацыя Царквы [9].

**Часопіс "Царква і народ" (1932–1933).**

Выдавец: Я. Красоўскі (БХД).

Чытацкая аўдыторыя: праваслаўныя беларусы.

Мэтавая арыентацыя: пазіцыянаваў сябе як беларускі праваслаўны часопіс, які "выступіў у абарону Праваслаўя" [11]. У ім асвятляліся праблемы ўзаемаадносін Царквы і дзяржавы, беларусізацыі Царквы, друкаваліся навіны з прыходаў і жыцця Віленскай кансісторыі, гістарычныя нарысы, вершы. У некаторых артыкулах аўтары закраналі тэмы пераходаў вернікаў у "сэктанцтва" і звязвалі гэта з забаронай малітваў па-беларуску ў іх Царкве.

**Часопіс "Да Злучэньня!" (1932–1937).**



Рэпазіторый ВДУ

Выдавецкі орган: Выдавецтва Таварыства Ісусавага (выдавецтва пры беларускіх айцах-езуітах з Усходняй місіі).

Чытацкая аўдыторыя: вернікі-ўніяты.

Мэтавая арыентацыя: паводле аўтараў, гэта "часопісь рэлігійная і мэтай ёсьць справа рэлігійнага злучэньня Беларускага народу" [5]. Мэту яны рэалізоўвалі з дапамогай тэматычнага напаўнення: друкаваліся дагматычныя, палемічныя і гістарычныя артыкулы, накіраваныя на папулярызацыю царкоўнай уніі сярод беларусаў.

**Газета "Kryniсa" ("Białoruskaja Krynica"; 1917–1940)**

**Выдавецкі орган:** Беларуская хрысціянская дэмакратыя.

**Аўдыторыя:** беларусы розных канфесій.

**Мэтавая арыентацыя:** у 1921 г. газета пазіцыянавала сябе як хрысціянска-дэмакратычная, з 1921 па 1927 гг. – сялянская газета, 1927–1939 гг. – палітычная, грамадская і літаратурная газета. "Kryniсa" мела выразную грамадска-палітычную скіраванасць. Так, тэматычны спектр матэрыялаў – гэта палітыка, нацыянальнае пытанне, сельская гаспадарка, эканоміка, культуры, кнігавыдавецтва. Сярод іншых тэм – праграмы БХД, гістарычныя нарысы, станаўленне Касцёла і ўніі. Тэма рэлігіі на працягу ўсіх гадоў не з'яўлялася асноўнай тэмай выдання, а фігуравала ў асобных інфармацыйных і аналітычных матэрыялах газеты [12].

**Часопіс "Chryscijanskaja dumka" (1928–1939).**

**Выдавец:** А. Станкевіч.

**Чытацкая аўдыторыя:** каталікі-беларусы [13, с. 1].

**Мэтавая арыентацыя:** паводле выдання – абуджэнне сярод беларускіх каталіцкіх мас каталіцкай і народнай беларускай свядомасці, стварэнне адпаведнай беларускай культурнай арганізацыі. Тэматычны змест часопіса – артыкулы на дагматычныя тэмы, штодзённасць Каталіцкага Касцёла ў Беларусі; публікацыі казанняў, гістарычных нарысаў, эсэ і вершаў на рэлігійную тэматыку [13].

На падставе апісанняў міжваенных беларускамоўных выданняў можна вылучыць іх наступныя тыпы:

1. *Канфесійны тып.* Выдаўцамі прэсы гэтага тыпу з'яўляюцца духоўныя асобы ці афіцыйныя царкоўныя або касцельныя структуры. Аўдыторыя – вернікі пэўнай канфесіі. Мэтавая арыентацыя – распавядаць пра царкоўнае ці касцельнае жыццё. Асаблівасць, якая сустракалася толькі ў канфесійных выданнях, – гэта пазнака, што яны выходзілі з дазволу духоўных улад. Таксама, іх адметнасць – пазнака пад загалоўкам, што выданне канфесійнае. Да гэтага тыпу мы аднеслі часопісы "Праваслаўны Беларус", "Да Злучэньня!" і "Хрысціянская думка". Акрамя таго, што дадзеныя часопісы адпавядаюць вылучаным крытэрыям, напрыканцы кожнага нумара "Да Злучэньня!" публікавалася, што выданне выходзіла "з дазволу духоўных уладаў" [5]. Часопіс "Хрысціянская Думка" выходзіў з дазволу віленскага каталіцкага арцыбіскупа-мітрапаліта. "Хрысціянская Думка" пазначала, што гэта "беларуская каталіцкая часопісь". "Да Злучэньня!" – "беларуская рэлігійная часопісь".

2. *Царкоўна-грамадскі тып.* Выдаўцамі такога тыпу часопісаў з'яўляліся царкоўныя і адначасова нацыянальныя рухі, лідары якіх былі пэўным чынам у апазіцыі да афіцыйных царкоўных улад. Такія выданні падымалі вострыя нацыянальныя і палітычныя пытанні, аднак асвятляліся яны праз дагматычную прызму пэўнай канфесіі. Да такога кшталту выданняў можна аднесці часопісы "Праваслаўная Беларусь", "Сьветач Беларусі", "Голас праваслаўнага беларуса".

3. *Царкоўна-культурны тып.* Выдаўцамі такога тыпу часопісаў з'яўляліся духоўныя асобы. Мэта іх выдання – не засяроджваць увагу на матэрыялах з палітычным кантэкстам, а, хутчэй, публікаваць асветніцкія і адкукацыйныя матэрыялы для беларускага насельніцтва, не забываючы пры гэтым пра рэлігійную тэматыку публікацый. Да такога тыпу можна аднесці часопіс "Беларуская зарніца".

4. *Грамадска-палітычны тып.* Выдаўцамі такога тыпу выданняў з'яўляліся палітычныя партыі ці рухі. Чытацкая аўдыторыя не залежала ад веравызнання мэтавай аўдыторыі. Такое выданне адрознівалася перыядычнасцю і частатой выхаду. Яно падымала злабадзённыя тэмы, якія тычыліся грамадскага і палітычнага жыцця. Да такога тыпу выданняў можам аднесці газету "Крыніца" ("Беларуская Крыніца").

Калі абагульніць усё вышэйсказанае, можна зрабіць наступныя высновы:

1. Былі вызначаны аптымальныя крытэрыі тыпалагізацыі міжваеннай прэсы: выдавецкі орган або выдавец, чытацкая аўдыторыя і мэтавая арыентацыя, якая ўключае праблемна-тэматычную арыентаванасць выдання. У некаторых выпадках пры вызначэнні тыпу выдання ўвага звярталася на тое, як яно само сябе пазіцыянавала. Аднак не заўсёды самавызначэнне сапраўды адпавядала тыпу, хутчэй за ўсё, на той момант вызначэнне тыпу газет ці часопісаў было абумоўлена іх зместам, тэматычнай разнастайнасцю.



Репозиторий ВГУ

2. Выданні, названыя С. Говіным канфесійнымі, на падставе вылучаных намі крытэрыяў былі пераразмеркаваны на 4 тыпы: канфесійныя, царкоўна-грамадскія, царкоўна-культурныя і грамадска-палітычныя.


1. Акопов, А. И. Методика типологического исследования периодических изданий (на примере специальных журналов). / А. И. Акопов. – Иркутск : Изд. Ирскутского университета, 1985. – 96 с.
2. Беларуская зарніца. – 1928. – № 1.
3. Говін, С. В. Канфесійны друк у Беларусі / С. В. Говін. – Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2008. – 287 с.
4. Голас праваслаўнага беларуса. – 1931. – № 1.
5. Да Злучэньня! – 1932. – № 1.
6. Корконосенко, С. Г. Основы журналистики : Учебник для вузов. / С. Г. Корконосенко. – М. : Аспект Пресс, 2001. – 287 с.
7. Праваслаўная Беларусь. – 1927. – № 1.
8. Праваслаўны Беларус. – 1925. – № 12.
9. Сьветач Беларусі. – 1930. – № 1.
10. Тумилович, Н. В. Основные типологические хараектристики современной региональной прессы Беларуси / Н. В. Тумилович // Веснік БДУ. – 2013. – № 1. – С. 63–68.
11. Царква і народ. – 1932. – № 1.
12. Białoruskaja Krynica. – 1927. – № 40.
13. Chryscijanskaja dumka. – 1932. – № 1.



**Сальков А. П.**


## СЛУЖЕБНЫЕ ДНЕВНИКИ КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ НАЦИОНАЛЬНО-ТЕРРИТОРИАЛЬНЫХ КОНФЛИКТОВ В ЕВРОПЕ КОНЦА 1930-Х – КОНЦА 1940-Х ГГ.

Дневник специфический исторический источник, предназначенный для накопления и сохранения информации через регулярные повседневные записи с целью ее обработки и анализа в будущем. Для заявленной проблемы подобный источник оказался весьма востребованным и содержательным. Своя богатая биография присуща не только их авторам, но и сами дневники имеет собственную историю составления, публикации и общественной оценки.

Дневник Георгия Димитрова – один из важнейших документов для понимания событий середины XX в. Беспристрастный, почти без оценочных суждений, документ позволяет взглянуть изнутри не только на международное коммунистическое движение. Он является неоценимым источником по истории конфликтов и идеи создания Балканской федерации, предполагавшей широкие этнотерриториальные трансформации. В силу значимости источника остановимся на нем подробней. Георги Михайлов Димитров (1882–1949) – видный революционер, руководитель Сентябрьского (1923) восстания в Болгарии, герой Лейпцигского 1933 г., генсек Исполкома Коминтерна (1935–1943), глава правительства Болгарии (1946–1949) и генсек ЦК Болгарской КП (1948–1949). Димитров начал записи сразу после ареста в Берлине в марте 1933 г. и вел их до своей смерти. Они делались на трех языках, в соответствие с периодами его жизни – немецком, русском и болгарском. Дневник (18 тетрадок, 1673 листа) находился в секретном партийном спецхране.

Впервые и в полном объеме Дневник был опубликован в Болгарии в 1997 г. трудами коллектива во главе с Димитром Сирковым. Издание стало выдающимся источниковедческим событием, однако отличалось скудными биографическими примечаниями [1]. Французское полное издание (2005) коллектива под руководством Гаэля Муллека, восполнило этот пробел, впервые подробно идентифицировав более трехсот персонажей [2]. Особо отметим полное трехтомное турецкое издание (2004), подготовленное Рустемом Азизом [3], в русскоязычном источниковедения незнаемое и даже не аннотированное. Все три полных издания Дневника, отражающих его целостность и динамизм, были сделаны на болгарском, французском и турецком языках, без учета трёхъязычия оригинального документа.

Известны публикации крупных хронологических фрагментов Дневника. Капитальное двухтомное немецкое издание (2000) под редакцией Бернхарда Байерляйна и Владислава Хеделера, касалось событий 1933–1943 гг., то есть, от Лейпцига до роспуска Коминтерна. Второй том составили великолепные комментарии и материалы к Дневнику, превосходящие его по объему [4]. Итальянское издание под редакцией Сильвио Понса (2002) посвящено периоду 1934–1945 гг., когда Г. Димитров пребывал в Советском Союзе [5]. В данном ряду стоит и необъяснимо запоздалое недавнее российское издание (2020), подготовленное редколлегией во главе с Т. Г. Зазерской, в которую входил и Г. Муллек [6]. Документ отложился в фонде Исполкома Коминтерна (ф. 495) РГАСПИ в личном деле Димитрова. Были использованы 1040 листов из VII, VIII и IX папок, которые представляют собой машинописную копию на русском языке, сделанную в 1960 г. Публикация охватывает период Великой Отечественной войны. Биографические справки на более чем 1600 персонажей из 35 стран для удобства приводятся в подстраничных ссылках.



Репозиторий ВГУ